Победу. Нам как наследникам победителей необходимо сохранять память о Великой Отечественной войне, помнить о героизме и мужестве тех, кто освободил мир от нацизма и сделал Победу нашим историческим достоянием и общим наследием.

**Список использованных источников**

1. Боевая и диверсионная деятельность оршанских подпольщиков и партизан // Управление по образованию Оршанского райисполкома. – URL: https://turism.goroo-orsha.by›files/01440/obj/110/19843 (дата обращения: 24.04.2025).

2. Первая партизанская бригада имени К. С. Заслонова // Партизаны Беларуси. – URL: https:www.partizany.by/brigade/69.html (дата обращения: 24.04.2025).

3. Отряд имени К. Е. Ворошилова // Партизаны Беларуси. – URL: https:www.partizany.by/group/413/partizany.by/brigade/69.html (дата обращения 24.04.2025).

4. Анкинович Леон Никифорович // Партизаны Беларуси. – URL: https://partizany.by/partisans/23559 (дата обращения: 24.04.2025).

5. Анкинович Леонид Леонович // Партизаны Беларуси. – URL: https://partizany.by/partisans/109526 (дата обращения: 24.04.2025).

6. Плугатарев, И. Гаврoши Великой Отечественной / И. Плугатарев // Белорусская военная газета. – 2013. – 11 янв. – С. 6.

7. Из отчета командования партизанского отряда № 1 им. К.Е. Ворошилова о боевой деятельности в тылу противника. 19 октября 1943 г. // Электронная библиотека исторических документов. – URL: https://www.docs.historyrussia.org/ru/indexes/values/894815 (дата обращения: 24.04.2025).

***І.І. Сацукевіч****, магістр гістарычных навук*
*БДЭУ (Мінск)*
*ivansat@rambler.ru*

## ПЕРШАЯ ПУБЛІЧНАЯ КАЗНЬ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ У МІНСКУ І ПРАБЛЕМЫ ЯЕ МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫІ

Тэма даследавання беларускага падпольнага руху застаецца адной з найбольш актуальных у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва гэта тычыцца гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля, дзе і сёння застаецца вельмі шмат белых плям. Сёння, калі востра стаіць пытанне захавання гістарычнай памяці беларускага народа, праблема мемарыялізацыі

гераічнай дзейнасці Мінскага антыфашысцкага падполля набывае асаблівую каштоўнасць. Задачай дадзенага даследавання з’яўляецца дакладная лакалізацыя месцаў казні падпольшчыкаў 26 кастрычніка 1941 г. і вызначэнне ступені іх мемарыялізацыі.

У фундаментальным выданні «Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944» сярод іншых фотадакументаў, якія ілюстравалі зверствы акупантаў, прысутнічае фота савецкіх грамадзян, павешаных акупантамі ў г. Мінску. Што гэта за грамадзяне, калі і дзе адбылася казнь, падпісана пад фотаздымкам не было [1, с. 378]. Можна заўважыць, што ў якасці шыбеніцы нацысты выкарысталі дрэва побач з тарцавой сцяной мураванага, не менш чым трохпавярховага будынка. У тым жа выданні на іншай старонцы была праілюстравана трыма фотаздымкамі яшчэ адна казнь – расправа фашысцкіх карнікаў над савецкімі патрыётамі ў г. Мінску 26 кастрычніка 1941 г. [1, с. 370].

26 кастрычніка 1941 г. у цэнтры Мінска адбылася першая масавая публічная казнь [2, с. 11]. У той дзень былі павешаны ўдзельнікі першай аб’яднанай падпольнай групы з ліку медыкаў і работнікаў чыгуначнага вузла – К.І. Трус, В.Ф. Шчарбацэвіч і інш. [3, с. 71]. Рабочы вагонарамонтнага завода К.І. Трус (кіраўнік) і культработнік трэцяй бальніцы В.Ф. Шчарбацэвіч арганізавалі падпольную групу па выратаванні камандзіраў Чырвонай арміі, раненых ваеннапалонных. У групу таксама ўваходзіў сын В.Ф. Шчарбацэвіч – Уладлен, яе сястра Н.Ф. Янушкевіч і брат П.Ф. Янушкевіч, суседка па дому па Камуністычнай, 48 А. Астроўская. Толькі за ліпень – жнівень 1941 г. група вывела з бальніцы 48 чалавек. Група была раскрыта, яе ўдзельнікі схоплены і 26 кастрычніка 1941 г. 12 членаў гэтай групы былі павешаны [4, с. 71].

У фондах Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і ў адкрытым доступе ў сетцы Інтэрнэт можна знайсці некалькі дзясяткаў фотаздымкаў першай публічнай казні падпольшчыкаў 26 кастрычніка 1941 г. З іх аналізу вынікае, што 12 падпольшчыкаў акупанты падзялілі на 4 групы па 3 чалавекі. Кожная група, якая складалася з адной жанчыны і двух мужчын, суправаджалася фатографам і была пакарана смерцю ў асобным месцы Мінска. Больш за ўсё ўвага фатографа была сканцэнтравана на групе, якую канвой вёў па вуліцах Мінска на месца казні на браме ля прахадной Дрожджавага завода ў прадмесці Ляхаўка. Тут былі пакараны смерцю кіраўнік групы К.І. Трус, В.І. Шчарбацэвіч і М.Б. Брускіна. Аўтар налічыў 12 розных фотаздымкаў гэтага працэса, што дазволіла беспамылкова пацвердзіць месца пакарання на сучаснай вуліцы Кастрычніцкай ля дрожджавага завода. У 1976 г. на сцяне будынка Мінскага дрожджавага камбіната была ўсталявана мемарыяльная дошка падпольшчыкам, пакараным смерцю там 26 кастрычніка 1941 г. [5, с. 94]. Аднак за апошнія 80 гадоў змянілася тапаграфія гэтага месца: была знесена старая драўляная брама і прахадная завода, пабудаваны новыя прамысловыя

карпусы. Прылеглая да завода тэрыторыя была абнесена агароджай, з-за чаго быў абмежаваны фізічны і візуальны доступ да мемарыяльнай дошкі. Таму яе перанеслі са сцяны завода на вялікі камень на іншым участку ля вуліцы Кастрычніцкай, аддалены ад месца казні на 100 м на паўднёвы ўсход.

Другая група падпольшчыкаў у той жа дзень 26 кастрычніка 1941 г. была пакарана смерцю на скалочаных з дошак шыбеніцах на тэрыторыі тады Цэнтральнага, а зараз – Аляксандраўскага сквера. У 1979 г. у скверы быў усталяваны помнік падпольшчыкам, аўтарамі якога сталі скульптар А.А. Анікейчык і архітэктары Ю.М. Градаў і Л.М. Левін [6, с. 48]. Помнік уяўляе сабой невялікую гранітную пліту са слядамі босых ног, сімвалічным калючым дротам і плітой з лаканічным надпісам. 7 мая 1942 г. у гэтым жа скверы былі павешаны сакратар Мінскага падпольнага гаркама КПБ І.П. Казінец і падпольшчык М.Г. Дземідзенка. Таму гэты сціплы помнік можна лічыць агульным мемарыялам Мінскаму антыфашысцкаму падполлю.

Заўважым, што помнік пастаўлены не на месцы пакарання (паўднёва-усходняя частка сквера, сцежка паміж Купалаўскім тэатрам і алеяй, якая выводзіць да помніка-танка), а за 70 м на захад ад яго ў паўднёва-заходняй частцы Аляксандраўскага сквера. Няма адзінадушша ў справе ідэнтыфікацыі павешаных тут падпольшчыкаў. Так, у «Зборы помнікаў гісторыі і культуры» сцвярджаецца, што у Цэнтральным скверы нацысты пакаралі В.Ф. Шчарбацэвіч, яе сястру Н.Ф. Янушкевіч і брата П.Ф. Янушкевіча [7, с. 143]. Тое ж напісана і ў кнізе «Памяць. Беларусь» [8, с. 38]. Аднак гэта не так – на фота злева і справа ад В.Ф. Шчарбацэвіч (дакладна ідэнтыфікаванай) бачны двое невядомых мужчын. На жаль, гэта недакладная інфармацыя патрапіла на подпіс на помніку падпольшчыкам.

Трэцяя група падпольшчыкаў была пакарана смерцю 26 кастрычніка 1941 г. ля, як узгадвалі сведкі, Камароўкі [9, с. 66]. Яшчэ месца пакарання называлі плошчай насупраць Камароўскага рынка [10, с. 86]. Камароўкай у сярэдзіне XX ст. мінчане называлі як велізарнае па памерах прадмесце на паўночна-уходняй ускраіне горада, так і невялікі харчовы рынак, размешчаны паміж Камароўскімі віламі (зараз плошча Якуба Коласа) і Камароўскім балотам. Сёння на месцы былога рынка размешчаны карпусы былога Мінскага завода вылічальнай тэхнікі на вуліцы В.З. Харужай. Дапаможа нам дакладна лакалізаваць месца казні адзіны яе фотаздымак.

Ансамбль плошчы Якуба Коласа сфарміраваўся толькі ў сярэдзіне 1950-х гг. Да гэтага ніякай плошчы там не было: тое, што мінчане называлі Комароўскай плошчай (Камароўскімі віламі), было скрыжаваннем пад вельмі вострым вуглом чатырох вуліц – Савецкай (праспект Незалежнасці да плошчы Якуба Коласа), Краснай, Пушкінскай (праспект Незалежнасці за плошчай Якуба Коласа) і Лагойскага тракта (вуліца Якуба Коласа). Пры гэтым Пушкінская была прамым працягам Краснай, а Лагойскі тракт – Савецкай вуліцы.

Камароўскія вілы не пацярпелі падчас бамбардзіровак Мінска ў пачатку вайны, таму сталі разам з Суражскім рынкам (зараз тэрыторыя Белмедпрэпаратаў насупраць прыпынка «Інстытут культуры») асноўнай гандлёвай пляцоўкай горада. У 1940 г. на агародах паміж Пушкінскай вуліцай і Лагойскім трактам быў пабудаваны Інстытут фізкультуры – велічны будынак, які ўзвышаўся над драўлянымі аднапавярховымі прыземістымі хаткамі старой Камароўкі. Менавіта будынак Інстытута фізкультуры, які адзіны захаваўся ад даваеннай забудовы і ўвайшоў у пасляваенны ансамбль новай Камароўскай плошчы (з 1956 г. – плошча Якуба Коласа), дазволіць нам дакладна лакалізаваць месца пакарання падпольшчыкаў 26 кастрычніка 1941 г. Гэта месца – пляцоўка перад помнікам Якубу Коласу ў цэнтры плошчы.

Аднак па невядомай нам прычыне мемарыяльную дошку ў 1970-ыя гг. усталявалі за 150 м ад гэтага месца – на сцяне аднаго з карпусоў Мінскага завода вылічальнай тэхнікі па вуліцы В.З. Харужай, 2. Надпіс «на этом месте» відавочна ўводзіць у зман жыхароў Мінска і яго гасцей. Акрамя таго, на дошцы няправільна ўказана дата казні – 26 лістапада 1941 г. З трох пакараных нацыстамі падпольшчыкаў ідэнтыфікавана была толькі А. Астроўская – партніха, суседка В.Ф. Шчарбацэвіч па дому, якая перашывала для выведзеных са шпіталя ваенапалонных камандзіраў Чырвонай арміі грамадзянскае адзенне і давала ім начлег.

Месца чацвёртай казні 26 кастрычніка 1941 г. звычайна ўказваецца як вуліца К. Маркса [9, с. 66]. Але працягласць гэтай вуліцы складае 1,5 км. У якім канкрэтна месцы адбылася казнь? К. Дамарад удакладняе: «вуліца К. Маркса ля скрыжавання з вуліцай Камсамольскай» [10, с. 86]. І гэта – амаль дакладная лакалізацыя месца казні. За 80 м ад скрыжавання вуліц К. Маркса і Камсамольскай знаходзіцца будынак Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі, у якім ў 1930–1950-ыя гг. знаходзіўся гаркам КПБ, а ў гады акупацыі – гарадская камендатура.

Аналіз пяці фотаздымкаў, зробленых падчас казні, дазваляе дакладна вызначыць месца, дзе гэта адбылося. Казнь прайшла ў садзе згарэлага ў першыя дні вайны драўлянага дома па вуліцы К. Маркса. Тарцавая сцяна трохпавярховага суседняга дома належыць будынку гаркама КПБ (сучасны Нацыянальны гістарычны музей Беларусі па К. Маркса, 12). Абгарэлы чатыропавярховы будынак насупраць – жылы дом па К. Маркса, 21. У пачатку 1950-х гг. на месцы казні быў узведзены будынак сучаснага Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь (К. Маркса, 14 / Камсамольская, 36).

Такім чынам, чацвёртае месца казні 26 кастрычніка 1941 г. – гэта пляцоўка, якую зараз займае крыло будынка Міністэрства энергетыкі па вуліцы К. Маркса, 14. Гэта адзінае з чатырох месцаў казні патрыётаў-падпольшчыкаў 26 кастрычніка 1941 г., не ўшанаванае помнікам ці мемарыяльнай дошкай. На дадзены момант мемарыялізаваны тры з чатырох

месцаў казні падпольшчыкаў 26 кастрычніка 1941 г. Ніводны з гэтых трох помнікаў не знаходзіцца непасрэдна на месцы пакарання. На двух помніках прысутнічаюць факталагічныя памылкі. Для мемарыялізацыі апошняга месца казні патрабуецца ўсталяваць мемарыяльную дошку (барэльеф, гарэльеф) на фасаднай сцяне правага крыла будынка Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь, які выходзіць на вуліцу К. Маркса, 14.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944 / Центр. гос. архив Окт. революции и социалист. стр-ва БССР, Ин-т истории Акад. наук БССР, Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; сост.: З. И. Белуга [и др.]. – Минск : Беларусь, 1965. – 464 с.

2. Без срока давности. Беларусь. Преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны. Минская область : сб. архив. документов и материалов / сост.: А. Р. Дюков, В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; редкол.: А. К. Демянюк [и др.] – Минск : НАРБ ; М. : Фонд «Историческая память», 2022. – 784 с.

3 Памяць Беларусі. Рэспубліканская кніга / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск : БелЭн, 2005. – 592 с.

4. Мінскае антыфашысцкае падполле / аўт.-укл.: Я. І. Бараноўскі, Г .Дз. Кнацько, Т. М. Антановіч [і інш.]. – Минск : Беларусь, 1995. – 256 с.

5. Прахаровіч, Н. Е. Мемарыяльная дошка падпольшчыкам / Н. Е. Прахаровіч // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1988. – С. 94.

6. Памятники Минска / авт.-сост. В. П. Шамов. – Минск : Полымя, 1991. – 208 с.

7. Лапцэвіч, Л. Г. Помнік падпольшчыкам / Л. Г. Лапцэвіч // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1988. – С. 143.

8. Памяць. Беларусь. Рэспубліканская кніга / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – 624 с.

9. Фрейдин, В. Они не стали на колени / В. Фрейдин // Уроки Холокоста: история и современность : сб. науч. работ / сост. Я. З. Басин. – Минск, 2009. – С. 15–68.

10. Доморад, К. Подвиг и подлог / К. Доморад // Уроки Холокоста: история и современность : сб. науч. работ / сост. Я. З. Басин. – Минск, 2009. – С. 86–88.